школьнікаў Ленінскага р-на Мінска (1978—88, кіраўнік М.Бурая). З 1979 існуе калектыў П. школы-інтэрната № 13, для дзяцей, якія дрэнна чуюць (кіраўнік Т.Бекіш), з 1983 — тэатр-студыя «Ронд» пры Доме піянераў і школьнікаў Кастрычніцкага р-на Мінска (з 1989 Палац дзяцей і моладзі, рэжысёр І.Маркава). Пастаноўку драм. П. рабілі мінскія Тэатр-студыя кінаакцёра (спектакль «Прабачце, свабодных месцаў няма», рэж.-пастаноўшчык і сцэнарыст К.Адамайціс, мастак-пастаноўшчык Дз.Мохаў, 1987), маладзёжны т-р (спектакль «Сабор Парыжскай Божай Маці» паводле В.Гюго, рэж.-пастаноўшчык Адамайціс, мастак-пастаноўшчык Мохаў, 1988), камерны т-р «Модус Вівендзі» сцэнічна вырашыў у стылі «драмы без слоў» монаспектакль «Запіскі вар'ята» (паводле М.Гогаля, рэж.-пастаноўшчык І.Мацкевіч, 1993). Элементы П. выкарыстоўваюцца ў пастаноўках Бел. т-ра юнага гледача, Нац. акад. т-ра імя М.Горкага, Нац. акад. т-ра імя Я.Купалы і інш. На развіццё П. на Беларусі значна паўплывалі Міжнар. фестываль П. на IV Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Маскве (1957), міжнар. фестывалі глухіх мімаў у г. Брно (Чэхія), усесаюзныя ленінградскія мім-парады, кіеўскія мім-парады, у якіх удзельнічалі калектывы з Беларусі. З 1987 на Беларусі праводзіцца фестываль аматарскіх тэатраў і ансамбляў П. «Блазен».

У розныя гады на Беларусі гастралiравалі сольныя мімы, тэатры і ансамблі П.: М.Марсо, П.Герман («Сандкорн-тэатр», г. Карлсруэ, Германія; удзельнічаў на Міжнар. фестывалі тэатраў-студый у Мінску «Каляды-91»), Пражскі т-р «На Забрадлі» Л.Фіялкі, Каўнаскі т-р П. (рэж. К.Адамайціс), маскоўскія ансамбль пантамімы А.Жаромскага, пластычнай драмы (рэж. Г.Мацкявічус), клоун-мім т-р «Ліцадзеі» (рэж. В.Палунін, С.-Пецярбург), т-р-студыя клаунады і пластычнай мініяцюры «Мімікрычы» (рэж. В.Крукаў, Кіеў) і інш.

*Р.І.Баравік, М.Б.Бурая.*

**«ПА́ПАРАЦЬ-КВЕ́ТКА»**, драма ў 3 актах, 5 карцінах з пралогам І.*Козела.* Напісана ў 1957. На прыкладзе сямейнай дысгармоніі паказаны цяжкі лёс сялян Зах. Беларусі ў перыяд уваходжання яе ў склад Польшчы. Аўтар удала выкарыстаў бел. легенду пра пошукі чалавекам кветкі шчасця, якая арганічна ўведзена ў п'есу. Пастаўлена ў 1957 у Бел. рэсп. т-ры юнага гледача як нар. драма. Рэжысёр Л.Мазалеўская, мастак І.Пешкур, кампазітар А.Туранкоў, дырыжор Я.Глебаў. Найбольшае спачуванне гледачоў выклікаў трагічны вобраз Яніны, перакана́уча створаны Л.Цімафеевай. У іншых ролях: Антось Лабыш — К.Пельтцэр, Анатоль — В.Лебедзеў, Ганецкі — А.Бяляеў, Лявон — П.Дубашынскі, Надзя — Э.Зайцава, Адась — Б.Барысёнак, Міхась — У.Унукаў, Люба — С.Мацюкевіч, Максім — Г.Ручымскі, Альжбета — А.Ротар, Марыля — Ю.Фляйто, Янук — У.Говар-Бандарэнка, Базыль — В.Окалаў, дзед Струкач — У.Бузук, Жабрак — Л.Міхайлаў, Камендант паліцыі — Б.Берцінг, Ведзьма — В.Козмер. Спектакль вылучаўся яркай нац. своеасаблівасцю, маляўнічасцю, стройнай логікай развіцця падзей, глыбокай распрацоўкай характараў, ансамблевасцю акцёрскага выканання. Ён выявіў творчы рост маладога калектыву тэатра, стаў этапным у яго дзейнасці. На Усесаюзным фестывалі драм. і муз. тэатраў, ансамбляў і хароў у гонар 40-й гадавіны Кастр. рэвалюцыі (Масква, 1958) спектакль адзначаны Дыпломам І ступені. Двойчы паказаны (27.12.1958 і 3.1.1959) на Дэкадзе бел. мастацтва, прысвечанага 40-годдзю БССР (Мінск). Шэраг сезонаў і гастроляў тэатр адкрываў «П.-к.». Амаль 10 гадоў спектакль не сыходзіў са сцэны і меў нязменны поспех у гледачоў. У 1958 пад назвай «Кветка шчасця» пастаўлены Брэсцкім абл. драм. т-рам. Рэжысёр Я.Батурын, мастак А.Гзыла. П'еса мела поспех і на аматарскай сцэне. Спектакль драм. калектыву Слуцкага Дома культуры (рэжысёры К.Лужанская і М.Бортнік) вызначаўся народнасцю ў абмалёўцы характараў, выразнымі масавымі сцэнамі, яркімі касцюмамі, музыкай, танцамі. На Рэсп. конкурсе ў Мінску (снежань 1960) адзначаны Дыпломам II ступені, калектыву прысвоена званне нар. тэатра. У пач. 1965 на аглядзе маст. самадзейнасці Мінскай вобл. аматары в. Цімкавічы Капыльскага р-на паказалі спектакль па «П.-к.» (кіраўнік З.Раманенка). Некаторы час над яго падрыхтоўкай з калектывам працавала актрыса В.*Галіна.* Цікавае сцэнічнае вырашэнне прапанавалі і аматары Целяханскага Дома культуры (Івацэвіцкі р-н; кіраўнік Л.Уліцына). Спектакль паказваўся на Рэсп. фестывалі тэатральнага мастацтва ў Мінску (лют. 1967), па яго выніках калектыву нададзена званне нар. тэатра. «П.-к.» ставіў аматарскі фальклорны муз.-драм. т-р «Жалейка» Гомельскага Палаца культуры будаўнікоў (кіраўнік М.Макарцоў). У яе арганічна ўведзены бел. песні, паданні, прымаўкі, нар. харэаграфія.

*Л.А.Лявонава.*

**«ПА́ПАРАЦЬ-КВЕ́ТКА»**, культурна-асветная арг-цыя ў Слуцку ў 1917—20. Мела на мэце стварэнне аматарскіх драмгурткоў, кі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раўніцтва імі і забеспячэнне іх рэпертуарам. Кіраўнік — А.Бараноўскі. «П.-К.» складалася з 3 секцый: літ., краязнаўчай, драм.-харавой. У складзе каля 200 удзельнікаў (інтэлігенцыя, перадавая моладзь, рабочыя). Арганізацыя насіла культ.-асв. характар, у час. герм. і польскай акупацыі набыла і палітычны. Змагалася за адраджэнне нац. мовы і культуры. Асаблівая ўвага звярталася на падбор рэпертуару, уключэнне ў паказы твораў, якія адпавядалі сучаснасці і мэце работы арганізацыі. У рэпертуары: «Госць з катаргі», «Бязвінная кроў», «Душагубы», «Суд», «Апошняе спатканне» У.Галубка, «Рысь», «Хам» паводле Э.Ажэшкі, «Паўлінка» Я.Купалы, «Модны шляхцюк» К.Каганца, вершы Я.Купалы, Я.Коласа, Ц.Гартнага і інш. Драм. паказы адбываліся па святочных днях і ладзіліся бясплатна. Шмат выступленняў адбылося ў Слуцку і ў навакольных вёсках. «П.-К.» стварыла гурткі-філіі: «Зарніца» ў в. Старыца, «Крыніца» ў в. Заслонне, школьны гурток у в. Грозаў, «Зорка» ў в. Ліпнікі і інш. Пасля вызвалення Беларусі «П.-К.» перадала свае функцыі Слуцкаму аддзелу культуры, а драм. секцыя была ўзята на дзярж. забеспячэнне.

*І.А.Алексніна.*

**ПАПО́ВА** Алена Георгіеўна (н. 12.10.1947, г. Лягніца, Польшча), драматург. Скончыла Літ. ін-т імя М.Горкага (1973). У 1973—77 працавала рэдактарам-кінадраматургам, асістэнтам рэжысёра на кінастудыі «Беларусьфільм», пам. гал. рэжысёра па літ. часцы ў Бел. т-ры Я.Купалы. У 2000—02 куратар ад Беларусі Бонскага біенале «Новая драма Еўропы». Першая п'еса «Плошча Перамогі» атрымала прэмію на Усесаюзным конкурсе маладой драматургіі 1975. Уздымае вострыя маральныя праблемы сучаснасці, паглыблена даследуе псіхалогію, космас чалавечай душы ў п'есах «Скорыя цягнікі» (паст. Бел. т-рам Я.Коласа, 1978), «Аб'ява ў вячэрняй газеце» (паст. Дзярж. рус. драм. т-рам Беларусі, 1982), «Ціхі прыстанак» (паст. Брэсцкім абл. драм. т-рам, 1983), «Жыццё Карыціна» (паст. Мінскім маладзёжным т-рам, 1985; т-рам імя Я.Купалы, 1988), «Маленькія радасці жывых» (паст. т-рам імя Я.Коласа, 1987), «Улюбёнцы лёсу» (1-я прэмія на Еўрап. конкурсе п'ес у Германіі 1994; паст. рус. драм. т-рам, 1997), «Шлях Карабля» (паст. т-рам імя Я.Коласа, 1998), «Развітанне з Радзімай» (паст. Рэсп. т-рам бел. драматургіі «Вольная сцэна», 1998), «Вандроўнікі ў Нью-Йорку» (паст. Нац. т-рам імя Я.Купалы, 2000), «Успаміны пра Вавілон, або Ал-ла-ла-ум» (паст. Магілёўскім абл. драм. т-рам, 2001), «Прыгоды малога Віруса» (паст. Мінскім маладзёжным т-рам, 2001) і інш. Аўтар сцэнарыя маст. тэлефільма «Наваселле» (паст. Бел. тэлебачаннем, 1979). Прэмія імя К.Крапівы 1999.

*Тв.:* Объявление в вечерней газете: Пьесы. Мн., 1989; Прощание с Родиной: Пьесы. Мн., 1999.

*Літ.:* Нікіціна А. Святло старога дома: П'есы Алены Паповай на сцэнах тэатраў Беларусі // Мастацтва Беларусі. 1985. № 6.

*Н.А.Крывашэева.*



*Сцэна са спектакля* ***«Папараць-кветка».*** *Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача. Пастаноўка 1957.*

**ПАПО́Ў** Іосіф Сцяпанавіч (21.9.1915, с. Сояна Мязенскага р-на Архангельскай вобл., Расія — 31.1.1984), рэжысёр, педагог. Нар. арт. Беларусі (1970). Скончыў Архангельскае тэатр. вучылішча (1938), вучыўся на рэ-



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ